Сяргей Дубавец: «Палюбіць Беларусь». Віталь Цыганкоў: «Няўдзячная гэта справа — быць несавецкім палітыкам ў савецкай Беларусі» (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 44.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская,56
Тэл./факс 362441

3 траўня 1996 г. | № 32 | Кошт свабодны

Лукашэнка незадаволены сваімі «бугаямі»

У панядзелак 29 красавіка прэзідэнт А.Лукашэнка выклікаў да сябе "на ковер" усё вышэйшае кіраўніцтва сілавых структураў.

Разгляд падзеяў 26 красавіка выліўся ў вельмі жорсткую крытыку перш за ўсё дзеянняў міліцыі і ўнутраных войскаў. Лукашэнка абураўся тым, што "здаравенныя бугаі" не здолелі намыліць шыю "кричащим юнцам", і заявіў, што калі сілавыя структуры будуць і далей "ліберальнічаць", то выступленні апазіцыі не скончацца ніколі.

Шэфу КДБ Уладзіміру Мацкевічу і намесніку міністра ўнутраных справаў Леаніду Ерыну дасталося за тое, што іхнія падначаленыя не змаглі затрымаць Зянона Пазьняка. Маўляў, Пазьняк яшчэ раніцай сышоў з варшаўскага цягніка ў Мінску, а КДБ пра гэта нічога не ведаў. А той факт, што Пазьняку ўдалося знікнуць праз "чорны" выхад са штаб-кватэры БНФ падчас начной аблавы, прэзідэнт назваў "непростительным".

Але больш за ўсіх перапала генеральнаму пракурору Васілю Капітану, якога прэзідэнт назваў "бэнээфаўскім стаўленікам" за тое, што падначаленая яму пракуратура не праяўляе актыўнасці ва ўзбуджэнні справаў супраць "основных зачинщиков". Сярод "зачинщиков", акрамя кіраўніцтва БНФ, былі названы дэпутаты Генадзь Карпенка, Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Дабравольскі і Павел Знавец. Загадана ўзбудзіць супраць іх справы і дамагацца ад парламента, каб той даў дазвол на прыцягненне іх да адказнасці. Пазбаўленне правоў чакае і БНФ. Па дадзеных з тых жа крыніцаў, міністр юстыцыі Сукала атрымаў на нарадзе загад рыхтаваць дакументы на забарону Народнага фронту.

А.П.

Пасля першамайскага мітынгу ў Мінску моладзь спаліла партрэт Лукашэнкі (падрабязнасці ў матэрыяле «Грамада» нарэшце прагрымела", стар. 3)

Чарговае прызнанне КС

29 красавіка Канстытуцыйны суд разгледзеў на прадмет адпаведнасці Канстытуцыі прэзідэнцкае распараджэнне ад 29 снежня 1995 года.

Згодна з гэтым распараджэннем дзяржаўныя структуры павінны былі няўхільна кіравацца нормамі прэзідэнцкіх указаў, прызнаных раней КС часткова ці цалкам неадпаведнымі Канстытуцыі. Адпаведна рашэнню КС, прэзідэнцкае распараджэнне не адпавядае Канстытуцыі і парушае шэраг артыкулаў законаў. КС рэкамендаваў парламенту прыняць заканадаўчы акт, дзе б рэгламентаваліся выпадкі, калі прэзідэнт можа выдаваць распараджэнні, а калі — указы. На паседжанне КС прадстаўнікі прэзідэнцкай адміністрацыі не з'явіліся. Запыты КС ў прэзідэнцкую адміністрацыю таксама засталіся без адказу.

СІМ

Ішлі як у бой

Як заявіў на прэс-канферэнцыі 30 сакавіка намеснік старшыні БНФ Станіслаў Гусак, супраць удзельнікаў шэсця "Чарнобыльскі шлях" улады кінулі не толькі міліцэйскія сілы, у тым ліку АМОН, спецназ, але і армейскія падраздзяленні, а таксама і расійскі АМОН.С.Гусак адзначыў, што дэманстрантаў збівалі дубінкамі са стальнымі стрыжнямі і шыпамі. Зафіксаваныя выпадкі, што ад удараў гэтымі дубінкамі ў людзей былі зламаныя рукі і рабрыны. Па ягоных словах, гэтая зброя (паводле інструкцыяў) можа выкарыстоўвацца толькі падчас затрымання асабліва небяспечных злачынцаў альбо ў баявых сітуацыях.

В.В

Баршчэўскага і Вячорку выпусцілі. Хадыка – за кратамі

У аўторак 30 красавіка двух лідэраў БНФ — Лявона Баршчэўскага і Вінцука Вячорку — выпусцілі на волю.

Л.Баршчэўскі вызваліўся ў выніку суда, на якім высветлілася, што ён быў арыштаваны беспадстаўна. В.Вячорку выпусціў пракурор, заявіўшы: "к сожалению, против вас мало улик".

Лявон Баршчэўскі быў схоплены ў 23 гадзіны 26 красавіка падчас налёту на штаб-кватэру БНФ. Яго разам з іншымі затрыманымі спачатку адвезлі ў Цэнтральны РАУС, дзе следчы мінскай гарадской пракуратуры У.Чумачэнка правёў допыт "у якасці сведкі". Але назаўтра на Баршчэўскага быў складзены іншы пратакол, ужо з абвінавачваннем у арганізацыі несанкцыянаванага шэсця 26 красавіка. Пасля гэтага забралі ўсе асабістыя рэчы і адвезлі ў спецразмеркавальнік (вул. Прылуцкая). Там зноў абшукалі і пасялілі ў камеру, дзе знаходзіліся 5 чалавек. Сярод іх быў журналіст газеты "Феміда" Алег Трызна.

У нядзелю 28 красавіка Л.Баршчэўскага перавялі ў іншую камеру, куды кінулі яшчэ 12 затрыманых. У панядзелак з раніцы распачаліся суды. Спецыяльна для гэтага з усіх сталічных райсудоў сюды камандзіравалі суддзяў, якія занялі вольныя камеры і адразу на месцы пачалі разглядаць справы затрыманых. Па чарзе да іх выклікалі людзей, і "двойкі" (суддзя і сакратарка) выносілі прысуд (ад 3 да 15 сутак).

Л.Баршчэўскі запатрабаваў, каб на яго судзе прысутнічаў адвакат. Пошук адваката доўжыўся амаль суткі. Тым часам яго пасялілі ў камеру, дзе сядзелі сем маладых хлопцаў. Баршчэўскі ад іх даведаўся, што чацвёра юнакоў увогуле не маюць ніякага дачынення да шэсця. Яны нават і не ведалі, што такая дэманстрацыя адбылася. Хлопцы расказалі, што 26 красавіка яны разам з дзяўчатамі адпачывалі каля будынка філармоніі. У дзесяць гадзін вечара да іх нечакана пад'ехаў аўтобус, адкуль выбеглі амонаўцы ў масках і з аўтаматамі. З прымяненнем дубінак яны паклалі хлопцаў ніцма на асфальт, а дзяўчат паставілі на калені. Потым хлопцаў пакідалі ў аўтобус і павезлі ў спецразмеркавальнік. Адзін з затрыманых, студэнт першага курса юрфака БДУ, сказаў Баршчэўскаму, што па дарозе іх атручвалі "Черемухой" і моцна збівалі. А ўжо на месцы, на вул. Прылуцкай, на кожнага афармілі пратаколы, у якіх загадзя былі напісаныя абвінавачванні, накшталт: у час шэсця шумеў, крычаў, не падпарадкоўваўся дзеянням міліцыі, быў у нецвярозым стане, заклікаў да звяржэння прэзідэнта. Следчаму заставалася ўнесці ў пратакол толькі прозвішча затрыманага. Што яны і рабілі.

У панядзелак 30 красавіка Баршчэўскага адвезлі ў Маскоўскі райсуд, дзе суддзя Рыбак вымушаны быў прызнаць, што супраць Баршчэўскага няма пэўных улік, і вызваліў яго. Акрамя таго, згодна з дзеючым законам аб Вярхоўным Савеце, Баршчэўскі, як былы дэпутат ВС, карыстаецца дэпутацкай недатыкальнасцю 2 гады.

(Працяг на стар.2)

БЕСПРЕДЕЛ

Спецслужбы не любяць гарачых сюжэтаў

У Мінску 1 Мая пачалося мэтанакіраванае паляванне на журналістаў.

На мінскага карэспандэнта НТВ Аляксандра Ступнікава і ягонага аператара Канстанціна Марозава напалі праз 15 хвілін пасля заканчэння на плошчы Незалежнасці першамайскага мітынгу. На вуліцы Свярдлова (паміж магазінам "Школьнік" і паштамтам) іх нечакана акружылі 5—7 здаравенных мужыкоў у цывільным. Адпіхваючы журналістаў у падваротню, невядомыя забралі ў іх тры відэакасеты, пры гэтым некалькі разоў ударыўшы аператара. Выпадковым прахожым, якія сталі сведкамі інцыдэнту, нападаючыя крычалі: "У них оружие!", а потым збеглі.

Каментуючы СВАБОДЗЕ гэтую падзею, Аляксандр Ступнікаў выключыў магчымасць звычайнага крадзяжу. "Гэтыя людзі адразу запатрабавалі відэакасеты і зусім не цікавіліся камерай, якая каштуе дзесяткі тысячаў доляраў," — патлумачыў журналіст. ён лічыць, што ім патрэбна была касета, на якой быў адзняты выпадак са спальваннем прэзідэнцкага партрэта. Беларускія спецслужбы, відаць, забаяліся, што "палаючага прэзідэнта" пабачаць на тэлеэкранах мільёны людзей у розных краінах.

Аднак самае цікавае, што Ступнікаў нават не збіраўся выкарыстаць гэты факт для навінаў НТВ. "У маім рэпартажы павінны былі з'явіцца інтэрв'ю з Ганчарыкам і Статкевічам ды карцінка плошчы з наступным аўтарскім тэкстам: "Сёння на першамайскі мітынг у Мінску сабраліся людзі пад чырвонымі, чырвона-зялёнымі і бел-чырвона-белымі сцягамі. Ва ўлады на гэты раз хапіла розуму, каб не сапсаваць свята ні тым, ні другім, ні трэцім"... Замест гэтых слоў журналісту давялося паведаміць гледачам пра інцыдэнт і зрабіць выснову, што ў Беларусі ўжо баяцца журналістаў, хаця ў іх ніколі не было зброі, а толькі мікрафоны ды камеры. Ступнікаў прасіў адзначыць, што іншыя тэлежурналісты праявілі выключную салідарнасць з брыгадай НТВ, прапанаваўшы ёй відэазапіс любых падзеяў дня, за што ён усім вельмі ўдзячны.

Праз гадзіну інцыдэнт на вул.Свярдлова атрымаў не менш дзікі працяг на праспекце Скарыны каля філармоніі. Там адбыўся напад на машыну расійскага тэлебачання, у якой ехалі кіраўнік карэспандэнцкага пункта РТР Леанід Свірыдаў і яшчэ чатыры яго калегі. Чорная "Волга", дзяржнумар 6143 МББ, якая, як у баевіку, уздоўж усёй трасы да плошчы Незалежнасці праследавала машыну РТР, раптам блакіравала яе на павароце каля філармоніі. З "Волги" выскачылі пяцёра мужчын і запатрабавалі тэлежурналістаў выйсці, каб "пагаварыць". Але брыгада РТР не разгубілася, заблакіравала дзверы. Прыкладна праз дзесяць хвілінаў, так і не здолеўшы запалохаць журналістаў, нападаючыя ад'ехалі. У сваім рэпартажы для "Вестей" Леанід Свірыдаў паведаміў пра гэты выпадак, паказаўшы сведак інцыдэнту. СВАБОДЗЕ ён заявіў, што бачыць прамую сувязь паміж абодвума выпадкамі, якія варта тлумачыць як тэрор супраць журналістаў. На яго думку, нападаючыя вельмі баяліся, што РТР падзеліцца гарачым сюжэтам з НТВ.

А распачаў журналісцкія "прыгоды" ў той святочны дзень выпадак на плошчы Незалежнасці. Там за 10 хвілін да пачатку мітынгу падвергліся бесцырымоннаму затрыманню фотажурналісты Марыя Жылінская з "Народнай газеты", Аляксандр Кушнер з "Рэспублікі" і Віктар Талочка з БЕЛТА. Іх схапілі ў той момант, калі яны фатаграфавалі калону з бел-чырвона-белымі сцягамі, якая ўваходзіла на плошчу Незалежнасці. Фотакарэспандэнтаў пазапіхвалі ў машыны, засвяцілі стужкі, а потым паадпускалі. Адзін з фотакарэспандэнтаў пазнаў у гэтых людзях асабістых ахоўнікаў беларускага прэзідэнта, якіх ён добра ведае ў твар.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Баршчэўскага і Вячорку выпусцілі. Хадыка – за кратамі

(Пачатак на стар.1)

Вінцук Вячорка вызваліўся 30 красавіка, адседзеўшы больш за трое сутак. З гарадской пракуратуры яго прывезлі ў штаб-кватэру БНФ на міліцэйскім "УАЗіку" як "матэрыяльна адказную асобу". Рэч у тым, што ў той дзень на штаб-кватэры следчыя з гарадской пракуратуры зноў праводзілі вобыск і адначасова апісвалі фронтаўскую маёмасць. Па словах следчага Чумачэнкі, мэбля і аргтэхніка Народнага Фронту павінны стаць закладам за страты, нанесеныя гарадской гаспадарцы падчас падзей 26 красавіка.

Пакуль следчыя перапісвалі крэслы і сталы БНФ, Вінцук Вячорка расказаў карэспандэнту СВАБОДЫ, што яго затрымалі раніцай 27 красавіка, калі ён выйшаў з дому, — побач з ім нечакана спынілася чорная "Волга", з якой выбеглі два моцных кэгэбісты ў скураных куртках і пацягнулі ў машыну. У гарадской пракуратуры, куды яго прывезлі, Вінцука дапыталі спачатку "ў якасці сведкі". Потым пасадзілі ў адну з камер спецразмеркавальніка, дзе ўжо знаходзіліся Ю.Хадыка і старшыня партыі аматараў піва А.Рамашэўскі. Што тычыцца Юрыя Хадыкі, то ён па-ранейшаму ўтрымліваецца за кратамі, яго абвінавачваюць у арганізацыі несанкцыянаванага шэсця. Сп. Хадыка абʼявіў галадоўку.

Лідэра "аматараў піва" А.Рамашэўскага спачатку абвінавачвалі ў хуліганстве, але потым прыдумалі іншы артыкул: ад яго патрабуюць прызнання, што гэта ён у лютым 1996 г. спаліў "лукашэнкаўскі" сцяг у будынку філфака БДУ. Рэч у тым, што міліцыя па сённяшні дзень не знайшла падпальшчыка. А пакольку Андрэй летась ладзіў шоў каля прэзідэнцкай рэзідэнцыі са спальваннем БССРаўскага сцяга, то, мабыць, і гэта яго рук справа.

Ірына Важнік выйшла з ізалятара пасля таго, як адседзела там трое сутак. Яна паведаміла наступнае:

"Вечарам 26 красавіка каля ГУМа я ўбачыла міліцэйскі аўтобус, з якога тырчэлі нечыя ногі. Калі падышла бліжэй, то ўбачыла, як па мужчыну топчуцца спецназаўцы. Я пазнала, што гэта схапілі Міколу Анціповіча, дацэнта Політэхнічнай акадэміі. Я кінулася абараняць яго. Яны сказалі "можаш забіраць свайго дзеда", і я села ў аўтобус. Па дарозе Мікалай Васільевіч мне расказаў, што яго білі ў жывот, па галаве і труцілі газам. Калі прыехалі ў Цэнтральны РАУС, яго спецназаўцы выкалі на вуліцу і прыціснулі да сцяны будынка. Я выклікала "хуткую дапамогу", якая адвезла яго ў бальніцу. Затым я пайшла ў штаб-кватэру БНФ, каб паведаміць аб тых здзеках, што я бачыла. Там нас усіх і захапілі. Калі нехта запытаўся, куды нас вязуць, адзін з іх з рогатам адказаў: "У Курапаты".

Прывезлі ў Цэнтральны РАУС, дзе мяне дапытваў следчы Чарноў. Пасля мяне адвезлі ў спецразмеркавальнік. Там мяне абшукалі і пасадзілі ў камеру, дзе знаходзіліся дзве жанчыны. Адна з іх — карэспандэнт украінскага тэлебачання ОТН Наталля Чынгулі. Другая жанчына была нехта Малахава, якая сядзела за тое, што ў яе скончылася часовая мінская прапіска. Нас вельмі здзівіла, што ахова ізалятара трымала яе ў якасці "хатняй работніцы". Кожную раніцу яе выклікалі з камеры, і яна вымушаная была цэлы дзень мыць падлогу, посуд, нават асабістыя машыны міліцэйскаму начальству. Мы ёй сказалі, што трэба паведаміць аб гэтым прэсе. Тая сказала, што баіцца, бо "будзе яшчэ горш". Па яе словах, у спецразмеркавальніку служаць адныя "сабакі", якія дзеля забавы б'юць яе па пятках — каб не пакідаць сінякоў".

У сераду, 1 мая, у рэдакцыю прыйшоў студэнт аднаго з мінскіх інстытутаў (па ягонай просьбе прозвішча не называем). Ён толькі што вызваліўся са спецразмеркавальніка, дзе праседзеў чацвёра сутак. Міліцыя яго схапіла ў пятніцу каля Нямігі, калі ён ішоў з Чарнобыльскага мітынгу дамоў. Студэнт прыйшоў у газету па просьбе свайго суседа па 20-й камеры — 18-гадовага Алега Гардзіенкі. Алег прасіў паведаміць прэсе, што ён абʼявіў галадоўку ў знак пратэсту супраць таго, што "двойка" незаконна прысудзіла яму 15 сутак.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

«Дзве легкавыя машыны – гэта класічная падстаўка»

Так лічыць адзін адказны супрацоўнік сілавых структураў, які пажадаў застацца невядомым.

У размове з карэспандэнтам СВАБОДЫ ён выказаў упэўненасць, што міліцэйскія машыны не выпадкова апынуліся на шляху шматтысячнай калоны дэманстрантаў на выхадзе з плошчы Якуба Коласа. "Нават благі спецыяліст ведае, што рабіць заслону легкавікамі — бессэнсоўна. Гэта лёгкая здабыча любога натоўпу, а тым больш 40-тысячнага. Дэманстрантаў проста падлавілі машынамі "на крючок" тыя, хто вельмі хацеў, каб сутычка з міліцыяй абавязкова адбылася", — лічыць суразмоўца. Па ягоных словах, ужо сама заслона каля кавярні "На ростанях" выглядала як правакацыя, бо дэманстранты, якім абвесцілі, што шэсце дазволена, не маглі не абурыцца і не пайсці напярад.

Алесь ПАЎЛОВІЧ

Нямецкая грамадскасць занепакоеная

Нямецкі саюз "Дзецям Чарнобыля" (Мюнстэр), які абʼядноўвае сотні грамадскіх гуманітарных ініцыятываў, накіраваў адкрыты ліст дэпутатам Бундэстага і Еўрапарламента, а таксама прэзідэнту Савета Еўропы спадарыні Фішэр.

У ім адзначаецца, што "чарнобыльскі рух і дэмакратыя ў Беларусі знаходзяцца ў вялікай небяспецы".

Саюз выказвае апасенне, што "забарона чарнобыльскага шэсця і арганізацый, якія ў ім удзельнічалі, з'яўляецца толькі пачаткам, і ў бліжэйшы час можна чакаць, што людзям у Беларусі пагражае абмежаванне свабоды перамяшчэння, турма і высылка".

Нямецкія грамадскія арганізацыі апелююць да Бундэстага, Еўрапарламента і Савета Еўропы з мэтай, каб яны "ясна растлумачылі прэзідэнту Лукашэнку, што правы чалавека, прафсаюзны і дэмакратычны рух, свабода слова і перамяшчэння, а таксама ўвага да голасу незалежных грамадскіх рухаў з'яўляюцца падмуркам еўрапейскай палітыкі".

У звароце адзначаецца, што "неабходна адкласці прыём Беларусі ў Савет Еўропы".

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Пратэст з Вашынгтона

Адна з найбольш аўтарытэтных у свеце журналісцкіх арганізацый — *CPJ* (Камітэт па абароне журналістаў) даслала Аляксандру Лукашэнку пратэст у сувязі з падзеямі 26 красавіка.

Ганаровым старшынёю *CPJ* з'яўляецца Уолтэр Кронкайт — бадай, самы, вядомы журналіст у гісторыі Амерыкі, рэйтынг даверу да якога перавышаў нават рэйтынг прэзідэнтаў ЗША. У дырэктарат Камітэта ўваходзяць папулярнейшыя тэлевядучыя, рэдактар *The New York Times* і г.д.

У сваёй заяве *CPJ* даволі падрабязна апісвае ўсе траўмы і пашкоджанні, якія атрымалі журналісты падчас падзеяў 26 красавіка ў Мінску. У сувязі з гэтым Камітэт выказвае рашучы пратэст супраць нападу на беларускіх, польскіх і расійскіх журналістаў, "якія спрабавалі мірнымі сродкамі выканаць сваё, забяспечанае міжнароднымі пагадненнямі права на свабоднае асвятленне навін". "Мы рашуча заклікаем вас забяспечыць вызваленне беларускіх журналістаў Трызну і Дзюбу, гэтаксама як усіх іншых карэспандэнтаў, затрыманых за асвятленне падзей. Заклікаем вас зразумець, што журналістам дазваляецца паўсюль у свеце асвятляць грамадскія падзеі без усялякіх перашкодаў", — гаворыцца ў заяве.

Дадаць можна хіба толькі тое, што журналіст дзяржаўнага Беларускага радыё У.Дзюба арыштаваны "па максімуму" — на 15 сутак.

Віталь ЦЫГАНКОЎ

Украінцы абвясцілі галадоўку

Яны патрабуюць адваката і сустрэчы з паслом

13 грамадзянаў Украіны, якіх затрымалі ў Мінску пасля падзеяў 26 красавіка, па-ранейшаму ўтрымліваюцца ў камерах спецразмеркавальніка на вул. Прылуцкай. Прычым па меншай меры пяць чалавек з гэтых 13-ці не маюць ніякага дачынення да УНСО. Напрыклад, сярод затрыманых знаходзяцца трое журналістаў украінскага тэлебачання.

Дарадца ўкраінскага пасла ў Мінску Уладзімір Салавей заявіў карэспандэнту СВАБОДЫ, што прадстаўнікі амбасады вядуць актыўныя перамовы з праваахоўнымі органамі Беларусі, каб вызваліць сваіх грамадзян. Ён сказаў, што 28 красавіка ўдалося вызваліць журналістку Наталлю Чангулі. Цяпер вырашаецца лёс астатніх людзей. Пры гэтым спадар Салавей заўважыў, што гэтыя пытанні даводзіцца абмяркоўваць вельмі далікатна, каб не папсаваць адносіны дзвюх краін.

Тым часам, пакуль дыпламаты вядуць перамовы, большасць арыштаваных украінцаў у знак пратэсту абвясцілі галадоўку. У іх ліку Андрэй Шэпціцкі, Сяргей Патапаў, Сцяпан Мярцала, Вячаслаў Гоч, Андрэй Міранюк, Андрэй Гоц і інш. Усе яны патрабуюць сустрэчы з адвакатам і з украінскім паслом. Але беларускія ўлады катэгарычна адмаўляюцца выканаць гэтае цалкам законнае патрабаванне арыштаваных.

Акрамя таго СВАБОДА даведалася пра некаторыя падрабязнасці жахлівага ўтрымання ў спецразмеркавальніку ўкраінскіх грамадзянаў. Беларускі навуковец Язэп Янушкевіч, які суткі знаходзіўся ў адной камеры з украінцам Уладзімірам Салаўём, расказаў наступнае.

45-гадовы сп.Салавей гасцяваў у свайго мінскага сябра. У той дзень ён выпадкова апынуўся на мітынгу. Спецназаўцы схапілі яго, пачуўшы, што ён размаўляе па-ўкраінску. У камеры № 21 Салаўю стала дрэнна, пачаў задыхацца (ён хворы на астму). А лекі, якія ён заўсёды носіць пры сабе, ахова адабрала. Уначы Салаўю стала зусім дрэнна. Паклікалі дзяжурнага афіцэра, той убачыў, што чалавек без медыцынскай дапамогі можа памерці, выклікаў "хуткую дапамогу". У медсястры, калі яна пабачыла на целе хворага мноства чорных пісягоў (ад дубінак), ад хвалявання задрыжэлі рукі. Урач сказаў, што ўкраінца трэба тэрмінова пакласці пад кропельніцу. Але афіцэр не дазволіў забраць яго ў бальніцу, спасылаючыся на тое, што "охрана отсутствует и некому сопровождать арестованного". Салавей (дарэчы, ён ліквідатар аварыі на ЧАЭС) застаўся пакутаваць у камеры яшчэ пяць сутак.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

P.S. Паводле нашых звестак, вечарам у сераду (1 траўня) у спецразмеркавальнік прыбыў прадстаўнік украінскага пасольства, але ён так і не змог сустрэцца з арыштаванымі грамадзянамі Украіны.

Gazeta Wyborcza пратэстуе

Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь атрымала афіцыйны пратэст, дасланы галоўным рэдактарам *Gazety Wyborczej* Адамам Міхнікам.

Пратэст выкліканы фактам збіцця беларускімі міліцыянтамі карэспандэнта газеты Цэзарыя Галінскага 26 красавіка ў Мінску. Функцыянеры ў мундзірах напалі на журналіста, калі ён з адлегласці у некалькі соцень метраў назіраў за ходам маніфестацыі. Яго ўдарылі дубінкай па твары, два разы ў патыліцу і двойчы па спіне.

"Наш журналіст не парушыў законаў вашай дзяржавы, — падкрэсліваецца ў пратэсце, — і не зрабіў нічога, што магло б апраўдаць такія нечалавечыя дзеянні. Асаблівую ўвагу звяртаем на тое, што наш карэспандэнт паказаў журналісцкую акрэдытацыю, выдадзеную Міністэрствам замежных справаў Рэспублікі Беларусь. Немагчыма, каб яны не заўважылі дакумент, але, нягледзячы на гэта, працягвалі біць. У дэмакратычнай дзяржаве такі выпадак не мог бы здарыцца".

Галоўны рэдактар буйнейшай польскай газеты зазначае, што гэты факт сведчыць пра непавагу да правоў журналістаў і пра незразумелае ігнараванне міліцыяй рашэнняў іншага дзяржаўнага органа — МЗС.

"Выказваем надзею, што тыя, хто збіў нашага карэспандэнта, панясуць адказнасць. Спадзяемся пачуць абяцанне, што такое больш не паўторыцца. Чакаем афіцыйных прабачэнняў", — заканчвае пасланне Адам Міхнік.

Зварот Народнага Руху Украіны

28 красавіка Народны Рух Украіны абнародаваў зварот "у падтрымку барацьбы беларускага народа за волю і дэмакратыю".

У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што 26 красавіка ў Мінску ўзброеныя атрады антынароднага рэжыму па-зверску расправіліся з удзельнікамі маніфестацыі і мітынгу. Узмоцненыя расійскімі падраздзяленнямі міліцыя і спецназ, гаворыцца ў звароце, па загаду беларускага прэзідэнта білі дубінкамі і труцілі газам мірных грамадзян. Народны рух Украіны звяртаецца да ўрадаў усіх еўрапейскіх краінаў з просьбай даць прынцыповую ацэнку гэтым падзеям у Беларусі.

Пікет пратэсту каля беларускага консульства

1 траўня ў Беластоку перад консульствам РБ каля 50 чалавек пратэставалі супраць парушэння прэзідэнтам Лукашэнкам грамадзянскіх правоў на Беларусі.

Імі распачаты збор подпісаў пад петыцыяй да беларускіх уладаў. Пікет наладзілі польскія беларусы і беластоцкая арганізацыя Уніі працы. З лозунгам "Жыве Беларусь!" пікетчыкі патрабавалі свабоду арыштаваным у Мінску 26 красавіка маніфестантам і публічнасці суда над імі.

С.А.

Заявление Фонда защиты гласности

В заявлении российского Фонда защиты гласности отмечается, что белорусские власти еще накануне событий 26 апреля пытались оказать давление на журналистов.

В частности, корреспонденты российских телекомпаний ОРТ и НТВ получили предупреждение: не снимать этот — альтернативный официальному — митинг, проводившийся в рамках акции "Чарнобыльскі шлях". Причем, если в случае с НТВ звонок был анонимный, то корреспонденты ОРТ были предупреждены об этом лично заместителем руководителя администрации президента Беларуси. В заявлении отмечается: "Неужели за десять лет, прошедших со дня Чернобыльской трагедии, власти ничего не поняли? Неужели до сих пор не ясно, что любая, подчеркиваем — любая общественно значимая информация должна быть достоянием гласности? Когда-то скрыли информацию о Чернобыле, и в день десятилетия этого совершенного властями преступления снова пытаются дозировать, что положено и что не положено знать обществу?

Если пользоваться чернобыльской терминологией, дозиметр, определяющий степень свободы слова в Беларуси, зашкаливает за красную черту опасности. В Беларуси пытаются вернуть средства массовой информации в режимное стойло".

Белорусский Хельсинкский комитет обратился за помощью к президенту России

Белорусский Хельсинкский комитет направил открытые письма спикеру белорусского парламента Семену Шарецкому, Митрополиту Филарету и президенту России Борису Ельцину.

В этих письмах выражена обеспокоенность теми репрессиями, которым подверглись участники шествия и митинга, состоявшихся 26 апреля в Минске, и просьба способствовать справедливому и непредвзятому расследованию этих событий.

В письме Борису Ельцину, в частности, отмечено: "Особую тревогу у нас вызывает тот факт, что попытки запрещения всякого публичного выражения своей политической позиции все чаще преобретают антироссийский оттенок. При разгоне митингов и мирный шествий, избиении демонстрантов подразделения специального назначения провоцируют антирусские настроения: они подчеркнуто игнорируют обращения на белорусском языке, требуют разговаривать только по-русски". Далее Белорусский Хельсинкский комитет обращается с просьбой к президенту России оказать содействие белорусским общественным, культурным и политическим деятелям в получении доступа к российским средствам массовой информации с целью правдивого освещения событий в Беларуси.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
3 траўня 1996 г., № 32

«Грамада» нарэшце прагрымела

Самы цікавы вынік першамайскай дэманстрацыі ў Мінску — моладзь пайшла за лідэрам Грамады Мікалаем Статкевічам

Калі да святкавання 1 Мая ў Мінску падыходзіць з меркамі, традыцыйнымі для апошніх двух месяцаў, то быццам і падзеяў асаблівых не было. Бо не было сутычак з АМОНам, не перакульвалі аўтамабілі, дубінкі не гулялі па галовах правых і вінаватых. І плюралізму на праспекце Скарыны ды плошчы Незалежнасці ў той дзень нібыта хапала. І ўсё ж сапраўдная падзея адбылася. Заяўку на палітычнае лідэрства на правым фланзе зрабіла Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, і ўпершыню за некалькі гадоў ёй гэта, здаецца, удалося.

Падзеі адразу развіваліся па сцэнары, на які, відаць, не разлічвалі ў фронтаўскай штабкватэры на Варвашэні. Тысячны натоўп, што сабраўся да паловы дзесятай раніцы каля філармоніі пад бел-чырвона-белымі сцягамі, нечакана падзяліўся ў спрэчцы вакол пытання, ці варта ісці на плошчу Незалежнасці. Сяргей Антончык заклікаў застацца і спаслаўся на інфармацыю з уладных колаў, згодна з якой рыхтуецца сутычка паміж чырвонымі і бел-чырвона-белымі, каб пашырыць палітычныя рэпрэсіі на БНФ. Абвяшчалася і рашэнне Управы Фронту, што было прынятае вечарам у аўторак: у мітынгу на плошчы Незалежнасці не ўдзельнічаць, каб не паддацца на правакацыю. Але ў той жа час лідэр БСДГ Мікалай Статкевіч заклікаў сабраўшыхся ісці наперад.

У 9:35 М.Статкевіч (які дэманстраваў дзіўную ўпэўненасць, што на галоўнай плошчы краіны іх нічога кепскага не чакае) вывеў на праспект прыкладна дзве сотні маладых людзей і пастроіў іх у калону пад бел-чырвона-белымі з ружай (грамадоўскімі) і бел-чырвона-чорным (партыі Свабоды) сцягамі. Калі праз гадзіну гэтая калона ўступіла на плошчу Незалежнасці, у ёй ужо было больш за чатыры тысячы чалавек, пераважна моладзі. А ў галаве ішлі, акрамя Мікалая Статкевіча, яшчэ і Мечыслаў Грыб, Лявон Дзейка ды іншыя вядомыя сацыял-дэмакраты. Калона на працягу шэсця скандзіравала "Жыве Беларусь!", "Незалежнасць!" і, асабліва громка, насупраць прэзідэнцкай рэзідэнцыі — "Далоў Луку!", а насупраць будынку КДБ — "Свабоду!"

Лідар БСДГ Мікалай Статкевіч вядзе калону на плошчу Незалежнасці

Усяго на плошчы Незалежнасці сабралася каля 50 тысяч чалавек (па словах мэра Уладзіміра Ярмошына). Калоны раёнаў складаліся з былога партыйна-савецкага актыву і ветэранаў. У прафсаюзных шэрагах побач з рабочымі стаялі ІТРаўцы ды прафсаюзныя актывісты з блакітнымі павязкамі на рукавах. Пад чырвонымі СССРаўскімі сцягамі сабраліся нешматлікія актывісты ДСПС (Движение за социальный прогресс и справедливость). Але пераважалі чырвона-зялёныя лукашэнкаўскія сцягі, якія трымалі самыя дужыя з мужчын. Карацей кажучы, у нашай краіне людзі самых розных заняткаў працягваюць адчуваць сябе пралетарыятам, якога нехта жорстка эксплуатуе.

Мяркуючы па выступах падчас мітынгу, гэтыя "нехта": крызіс, разбураныя эканамічныя сувязі, затрымкі заробкаў, урад, які не мае праграмы выхаду, і двойчы называўся нават прэзідэнт, які не хоча рэформаў. Апошні тэзіс, выказаны Міколам Статкевічам, быў сустрэты шэрагамі пад чырвонымі сцягамі незадаволеным гулам, а "грамадоўскай" калонай — воклічамі адабрэння. Затое потым, калі Віктар Чыкін працытаваў Рамэна Ралана, які назваў нацыяналізм "апошнім прытулкам нягоднікаў", рэакцыя паўтарылася з дакладнасцю наадварот.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што плюралізм на мітынгу быў. Але высокае начальства, што прысутнічала на мітынгу, не вельмі прыслухоўвалася да прамоўцаў. Яно ўжо ведала, што прэзідэнт на мітынг не прыедзе і не цягнулася да мікрафону зрываць голас. Мэр Мінска Уладзімір Ярмошын, якога спачатку абвясцілі сярод прамоўцаў, смаліў адну за адной танныя папяроскі, слухаючы міністра культуры Аляксандра Сасноўскага, які па старой гарвыканкамаўскай звычцы дзяліўся з ім апошнімі навінамі (як то: абвінавачванне Карпенкі ў бок Ярмошына, пра якое паведаміла мінулая СВАБОДА). А самым адкрытым, як заўсёды, быў прэзідэнцкі дарадца Сяргей Посахаў. Ён прапанаваў незалежным журналістам напісаць пра тое, што дагэтуль не мае кватэры і жыве з сям'ёй у адным пакойчыку інтэрната былой партшколы... Карацей кажучы, хто пра затрымку заробка, а хто — пра затрымку ордэра на кватэру (аб чым мы і паведамляем выключна з нагоды Дня міжнароднай салідарнасці). Весялосць, што панавала сярод начальства, толькі на хвіліну прыпынілася, калі Сяргей Антончык абвесціў з трыбуны, што стварае аргкамітэт па збору подпісаў за адстаўку прэзідэнта. Але пабачыўшы, як вяла адрэагавала на гэта плошча, кіраўнікі прасвятлелі і аднавілі абмен карыснай інфармацыяй.

У 12:15 мітынг абвясцілі закрытым. Першай з плошчы пайшла бел-чырвона-белая калона, да якой адразу пачалі далучацца шмат тых, хто прастаяў увесь мітынг на тратуары. У выніку сабралася прыкладна сем тысячаў, і такога моцнага "Жыве Беларусь!", якое прагучала, я не памятаю нават 2 красавіка. Здаецца, міліцыя тады па-сапраўднаму напалохалася. Калі я спытаў падпалкоўніка з рацыяй, куды ідуць людзі і што будзе далей, ён так шчыра адказаў "не ведаю", што я ўпершыню за апошнія гады паверыў міліцыянту.

Гарлавіну праспекта Скарыны ў той момант закрывалі толькі некалькі афіцэраў і "жыгулёнак", які пры жаданні не тое што перакуліць, а можна было за хвіліну разабраць на запчасткі. Але калона не спакусілася на легкавушку, павярнула направа і спынілася толькі на перакрыжаванні з вуліцай Кірава, дзе быў запалены каляровы партрэт першага беларускага прэзідэнта. "Хай гарыць на хаду!" — заклікаў Мікалай Статкевіч і павёў моладзь у сквер каля міністэрства гандлю. Там ён падзякаваў усім за арганізаванасць, паведаміў пра сем тысяч міліцыянтаў і вайскоўцаў, падрыхтаваных, па яго звестках, для разгону несанкцыянаваных мітынгаў, і заклікаў разыходзіцца, але трымацца групамі, схаваўшы нацыянальную сімволіку, "якая яшчэ спатрэбіцца". Развітаўся Мікалай Статкевіч з моладдзю наступнымі словамі: "Суайчыннікі! Я быў у вашым узросце, калі па тэлевізары паказвалі паўднёва-карэйскіх студэнтаў, якіх паліцыя разганяла ў Кванджу. І гэтаксама, мабыць, большасць у гэтай краіне асуджала іх, называючы экстрэмістамі. Але яны выраслі, праз дваццаць год пачалі кіраваць сваёй краінай і пасадзілі ўсіх тых прэзідэнтаў, якія аддалі каманду збіваць іх. Я веру, што гэтак жа будзе і ў нас. Жыве Беларусь!"

...Ад сябе я б дадаў, што ў Кванджу не толькі разганялі, але і забівалі моладзь. Упэўнены, што забывацца пра гэта не варта нікому. Ні прэзідэнту, ні тым, хто з ім цягаецца.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Затрыманні ў Магілёве

1 Мая ў Магілёве падчас санкцыяванага ўладамі мітынгу некалькі прадстаўнікоў БСДГ, Грамадзянскай партыі і Свабодных прафсаюзаў былі затрыманыя міліцыяй.

Пры гэтым ніякіх абвінавачванняў не прад'яўлялася, ніхто з людзей у форме афіцыйна не прадстаўляўся. У затрыманых канфіскавалі бел-чырвона-белыя сцягі і плакаты, нягледзячы на тое, што іхны змест цалкам адпавядаў палітыцы прэзідэнта. Напрыклад, на адным з канфіскаваных плакатаў было напісана: "Так — сацыяльным рэформам. Не — дзікаму капіталізму."

У час затрымання была прыменена фізічная сіла, у тым ліку да дэпутатаў магілёўскага гарсавета Алеся Сердзюкова і Цімафея Камозіна. Іх груба штурхалі, білі па нагах і прымусова зацягнулі ў міліцэйскі пастарунак. Паказальна, што прыехаўшы пазней пракурор Цэнтральнага раёна загадаў усіх адпусціць, паколькі ў дзеяннях затрыманых "няма ніякага крыміналу". Пакрыўджаныя ахвяры міліцэйскага самавольства, як паведаміў старшыня мясцовай філіі Грамадзянскай партыі Валеры Сівуха (ён таксама быў затрыманы), падалі ў пракуратуру заявы з патрабаваннем узбудзіць крымінальную справу супраць міліцыі па артыкулах "грабёж" (за незаконна канфіскаваныя плакаты і сцягі), "злоснае хуліганства" (за сілавыя дзеянні ў дачыненні да грамадзян) і "парушэнне дэпутацкага імунітэту" (за напад міліцыі на дэпутатаў гарсавета).

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Суд у Полацку

28 красавіка ў полацкі суд былі выкліканыя ўдзельнікі чарнобыльскага пікету, які сябры БНФ наладзілі ў горадзе 26 красавіка.

Але разгляд справы перанеслі на нявызначаны тэрмін. Суддзя, відавочна, не ведаў, за што караць пікетчыкаў, бо паводле беларускага заканадаўства на правядзенне пікета не патрэбен дазвол. Акрамя таго ў судзе высветлілася, што полацкія актывісты БНФ звярталіся да гарадскіх уладаў і 19 красавіка нават атрымалі дазвол на правядзенне пікета. Аднак 25 красавіка ў выканкам выклікалі старшыню Полацкай рады БНФ сп.Грыгаровіча і адмянілі свой дазвол. Тым часам заканадаўства дазваляе адклікаць дазвол не пазней чым за 3 дні да правядзення акцыі, і таму людзі спакойна выйшлі на вуліцу.

Васіль КРОКВА

З НАГОДЫ

Калона павінна пачынаць крок з адной нагі

1 мая 1937 года. Знаёмыя кадры кінахронікі: таварыш Сталін стаіць на Маўзалеі, унутры якога забальзамаваны труп Леніна. З вышыні Іосіф Вісарыёнавіч вітае працоўныя калоны, якія ажно захлынаюцца ад шчасця прайсці перад ім, па-вайсковаму трымаючы крок, пранесці ў сваіх руках вялізны партрэт свайго ўлюбёнага правадыра. Яшчэ адзін партрэт, значна большых памераў, лунае ў паветры над Краснай плошчай.

Сталін быў мудры і выдатна разумеў, як трэба кіраваць людскімі масамі. Ён даваў ім магчымасць адчуць плячо суседа і ўласную згуртаванасць, сам кіруючы працэсам. Гэты рытуал (як наркотык патрэбны масам) выконваўся двойчы на год у маштабах усёй краіны ажно да канца існавання СССР.

У Сталіна, канечне, не было ўласнага тэлебачання, ва ўсемагутнасць якога пры "прамыванні мазгоў" паверыў наш Лукашэнка. Безумоўна, ТБ — гэта вялікая моц, аднак нельга недаацэньваць і непасрэдныя кантакты з людзьмі. Як кажуць, лепш адзін раз убачыць самому, чымсьці сто разоў пачуць. Іншымі словамі, быць сведкам вельмі важна. Каб гэта было не так, усе аматары глядзелі б футбол па тэлевізары і не хадзілі на матчы. Аднак сапраўднае задавальненне, як вядома, можна атрымаць, толькі прысутнічаючы на стадыёне.

Чаму ж Лукашэнка ўпарта не жадае выйсці да народу і хаця б паўтарыць тое, што ён гаворыць у тэлестудыі, звяртаючыся да гледачоў? Па-першае, з тэлестудыі ён прамаўляе або да асобнага гледача, або да яго сям'і (г.зн. выключна да прыхільнай яму аўдыторыі, бо незадаволеныя звычайна выключаюць свой тэлевізар). Калі ён паявіцца, напрыклад, на плошчы Незалежнасці (а не на гарадской ускраіне на закладцы царквы, куды збяруць строга вызначаную публіку), дык выступаць яму давядзецца перад грамадой, якую ён сам раскалоў на два лагеры. Для "бацькі" гэта быў бы вельмі нявыйграшны момант. Акрамя таго, у такім адкрытым месцы і ў такой сітуацыі ён можа баяцца замаху.

Але праблема яшчэ і ў тым, што (як паказваюць апошнія падзеі) улады няздольныя сабраць масавы мітынг, а толькі — зборышча ўзброенай міліцыі. Выступаць жа перад значна меншай колькасцю людзей, чым збіраюць лідэры апазіцыі, для "бацькі", самі разумееце, не толькі несалідна, а нават проста абразліва.

Савецкія кіраўнікі, зрэшты, таксама былі не надта даступныя для простага люду. Але затое ў іх быў велізарны крамлёўскі палац для правядзення з'ездаў, дзе рэгулярна збіраліся некалькі тысяч чалавек, каб паслухаць справаздачу генеральнага сакратара. У іх таксама быў своеасаблівы дублёр, да якога можна было амаль у любы дзень наведацца ў Маўзалей. Кожнаму савецкаму чалавеку было тады добра вядома, што "Сталін — гэта Ленін сёння".

У А.Лукашэнкі падобнай магчымасці няма. Праўда, на пл. Незалежнасці дагэтуль стаіць вялізная ленінская статуя. Аднак ніхто сёння не лічыць, што "Лукашэнка — гэта Ленін сёння". Больш за тое, гэтая статуя нічога не дае прэзідэнцкай уладзе ў сэнсе ідэалагічным. Але заўсёды магчымы нечаканыя рашэнні.

Вядомы астролаг П.Глоба, напрыклад, у нядаўнім інтэрв'ю адной рэспубліканскай газеце ўпэўнена сцвярджае, што ў хуткім часе беларусы паставяць А.Лукашэнку помнік на пляцы Незалежнасці... Цяжка сабе ўявіць як будуць тады дзяліць прастору плошчы два роўнавялікія (бо прэзідэнт не можа быць меншым за Леніна) помнікі. Хіба што першы давядзецца прыбраць. Вось тады любы беларус зможа блізка-блізка падыйсці да бронзавага "бацькі". Толькі навошта? Астролаг на гэтае пытанне не адказаў.

Сяргей МАКСІМОВІЧ

«Аддзячым Кісялю»

У Полацку сябры дэмакратычных партый вырашылі пачаць акцыю "Аддзячым Кісялю".

На адрас старшыні Беларускай тэлерадыёкампаніі будуць накіраваныя сотні лістоў і тэлеграм з падзякамі за трансляцыю прапагандысцкага фільма пра падзеі 26 красавіка і асабліва за сюжэты пра УНА-УНСО. Цяпер нават падлеткі ў некаторых школах вітаюць адзін аднаго клічам: "Жыве нацыя! Смерць ворагам!"

Васіль КРОКВА

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Палюбіць Беларусь

Сяргей ДУБАВЕЦ

Тое, што рэжым А.Лукашэнкі часцей парушае Канстытуцыю краіны, чым выконвае яе, — стала ўжо "нормай". Пра гэта не раз заяўляў зняважаны прэзідэнтурай Канстытуцыйны суд. Прычым зайшло так далёка, што можна казаць пра перараджэнне самога інстытуту выканаўчае ўлады. Яе не спыняюць ані фактычна безуладны Вярхоўны Савет, ані заявы апазіцыі, ані крытыка ў незалежных СМІ. Разваліўшы юрыдычныя нормы жыцця краіны, рэжым Лукашэнкі замахнуўся на маральныя нормы жыцця народу. А ў гэтай сферы злачынствы звычайна не маюць тэрміну даўнасці.

Адзінае спадзяванне рэжыму ў такой сітуацыі — масавая падтрымка народа. Сацыялагічныя службы даюць на гэты конт супярэчлівыя звесткі. Паводле дадзеных лабараторыі А.Вардамацкага "Новак", два тыдні таму А.Лукашэнку падтрымлівала 62,2 % насельніцтва Беларусі. Тыдзень таму іншая незалежная сацыялагічная служба паведаміла па радыё 101,2, што на Магілёўшчыне, радзіме А.Лукашэнкі, яго падтрымліваюць толькі 16 % моладзі, а 60 % — супраць яго і ягонага саюзу з Расіяй. Чые звесткі больш праўдзівыя і адпавядаюць рэальнасці, паказала самое жыццё.

26 красавіка ў Мінску адбыліся сутыкненні... сотні затрыманых... сотні збітых да крыві. Супраць А.Лукашэнкі дэманстравала пераважна моладзь пад нацыянальнымі сцягамі.

Штосьці падобнае адбылося ўжо 24 сакавіка. А.Лукашэнка "лічна сьлядзіў і лічна даваў каманды прекраціць безабразія". У той дзень кроў пралілася каля тэлецэнтра і каля будынка КДБ. 2 красавіка А.Лукашэнкі ў Мінску не было. І не было сутыкненняў. Пасля мітынгу людзі разыходзіліся заміраныя. Здавалася, яшчэ трохі — і пачнецца братанне з амонам.

26 красавіка А.Лукашэнка зноў "камандаваў", і зноў пралілася кроў.

Першае злачынства рэжыму ў красавіцкіх падзеях — гэта **забарона "Чарнобыльскага шляху"**. Такія рэчы не забараняюць, як не забараняюць, прыкладам, пахаванне сваяка. Запланаванае шэсце было выразам яднання людзей у смутку. Дурню ясна: не будзь гэтай забароны — не было б ніводнага разбітага носа.

Генадзь Карпенка абвінавачвае ў правакаванні сутычак дэманстрантаў з міліцыяй мэра Мінска Ярмошына. Гэта гучыць праўдападобна, таму што Ярмошын — прыезджы ў Беларусі чалавек, які не разумее ані нашай чарнобыльскай драмы, ані нашага смутку. Але Ярмошын усяго толькі выканаўца...

Другое злачынства рэжыму, які да вушэй заграз у беззаконні, — гэта **правакацыя расколу ў грамадства**. А.Лукашэнка адчувае схільнасць беларусаў да братання з беларускай міліцыяй і таму гэтым разам для разгону дэманстрантаў запрасіў расійскі спецназ. (Напэўна прэзідэнт ведае свой рэальны рэйтынг.) Ніякіх братанняў! Бо любое братанне, любое несанкцыянавае яднанне беларусаў можа быць толькі супраць яго, А.Лукашэнкі. Яму патрэбны гэты раскол, каб адцягнуць увагу людзей ад уласнай непрадуктыўнай палітыкі. Вось чаму ён так настойліва зганяў людзей на свой афіцыйны мітынг, які не столькі смуткаваў па чарнобыльцах, колькі кляйміў бэнэфаўцаў.

Трэцяе злачынства рэжыму — **рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі**. Трэба мець клінічна хворае ўяўленне, каб дапусціць, што гісторык мастацтва прафесар Юры Хадыка, мовазнаўца Вінцук Вячорка, перакладчык Алесь Баршчэўскі, гісторык літаратуры Язэп Янушкевіч, лацініст Алесь Жлутка ды многія-многія іншыя вядомыя стваральнікі сучаснай беларускай гуманітарнай навукі і культуры здольныя на якое-кольвек злое дзейства. А.Лукашэнка пасадзіў "галавасцікаў", якія гавораць на дзясятках моваў, выдалі па некалькі кніг, выхавалі некалькі пакаленняў спецыялістаў, — за краты, да бамжоў і крымінальнікаў. Калі ж дадаць сюды той факт, што людзей пасля шэсця хапалі па прыкмеце мовы, то можна гаварыць не толькі пра антыбеларускую, але і пра антыкультурную палітыку рэжыму.

Усе замежныя і незалежныя беларускія СМІ, уся беларуская інтэлігенцыя, — усё, што ў гэтай краіне не залежыць ад А.Лукашэнкі, — не прымаюць А.Лукашэнку. І тлумачыцца гэта проста. Наша інтэлігенцыя прывыкла да розных кіраўнікоў, але ніхто з іх, ад Машэрава да Малафеева, ніколі не выказваў непавагі да Беларусі і беларускай мовы. А.Лукашэнка — першы, хто дапусціў непавагу ў дачыненні да беларушчыны. Гэта ён заявіў, што "Беларусь для меня — пройденный этап". Гэта ён дапусціў абразлівыя выказванні ў дачыненні да беларускай мовы. Гэтым ён наставіў самых памяркоўных з ліку беларускай навуковай і пісьменніцкай публікі, дзеячоў, чым сцягам нават у савецкі час быў канфармізм, — супраць сябе.

Няма ніякага сумневу, што прыхільны да Беларусі А.Лукашэнка, які б ён ні быў ва ўсіх іншых адносінах, ніколі не выклікаў бы такой знішчальнай крытыкі з боку інтэлігенцыі і такога росту радыкальных настрояў сярод моладзі.

26 красавіка Лукашэнка чарговы раз прадэманстраваў непавагу да Беларусі — краіны, якую волею выпадку ўзначаліў. Ён не разумее людзей у іх любові да Беларусі, у іх смутку па Беларусі.

Такім чынам, злачынствы названыя, і рана ці позна рэжым сядзе за іх на лаву падсудных. **адзіны шанц рэжыму** — гэта як мага хутчэй пасадзіць на гэтую лаву некалькі соцень тысяч чалавек — усіх сумленных і законапаслухмяных патрыётаў Беларусі.

Зрэшты, ёсць і яшчэ адзін шанц. Праўда, менш рэальны. Гэты шанц – палюбіць Беларусь.

Ярузельскі кажа, што страляць не загадваў

26 красавіка ў Катавіцкім ваяводскім судзе адбылося чарговае паседжанне па справе былых міліцыянтаў, якія ў снежні 1981 года падчас шахцёрскай забастоўкі стралялі ў людзей. Тады 9 чалавек загінулі, а 25 былі параненыя.

Працэс пачаўся 10 сакавіка 1993 г. і цягнецца ўжо больш як тры гады (увесь гэты час міліцыянты знаходзяцца за кратамі). На цяперашнім судовым паседжанні адным з трох сведкаў быў 73-гадовы генерал Войцэх Ярузельскі, які кіраваў краінай у часы ваеннага становішча. Ён даваў паказанні тры з паловай гадзіны. Паводле словаў Ярузельскага, кіраўніцтва дзяржавы не давала каманды ўжываць зброю. Генерал не выключае, што гэта была правакацыя з боку спецслужбаў іншых краін.

Калі ж і чым завершыцца гэты судовы працэс — невядома, тым больш што высвятляюцца новыя падрабязнасці і акалічнасці. Аднак для польскай грамадскасці відавочна, што злачынства мела месца і міліцыянтам давядзецца за яго адказваць.

Паводле Gazety Wyborczej

Колькасць ахвяраў Чарнобыля застаецца тайнай

На Венскай канферэнцыі "10 гадоў пасля Чарнобыля" аб'яўлена, што непасрэдна з Чарнобыльскай катастрофай звязана смерць толькі 31 чалавека.

Дарадца беларускага ўрада радыебіёлаг прафесар Эдмунд Ленгфельдэр з Мюнхена лічыць гэтую лічбу неаб'ектыўнай. У інтэрв'ю нямецкай газеце *Frankfurter Rundschau* ён называе 25.000 памерлых (спасылаючыся на дадзеныя міністэрстваў аховы здароўя трох краін — Беларусі, Украіны і Расіі).

"Каля 800.000 ліквідатараў з розных рэспублік былога СССР паразнаму падвяргаліся небяспецы, — лічыць прафесар Ленгфельдэр. — З вялікім спазненнем пачалі складаць спісы гэтых людзей. Згодна сакрэтнаму дэкрэту Крамля трымаліся ў тайне ўсе дадзеныя пра аварыю і хваробы. Асабліва засакрэчваліся дозы, якія атрымалі ліквідатары. Дозы не рэгістраваліся нават у медыцынскіх картах. Згодна ўрадавай пастанове, пры дозах ніжэй за 50 рэм, хвароба не павінна была звязвацца з радыяцыяй. Я лічу гэта крымінальным актам," — заявіў у інтэрв'ю нямецкі прафесар.

Як піша нямецкі бюлетэнь *Umweltpolitik*, даследчыкі амерыканскага міністэрства энергетыкі прагназуюць, што ў бліжэйшыя 50 гадоў ад рака (выкліканага радыеактыўным цэзіем) могуць памерці ад 14.000 да 39.000 чалавек. Па меншай меры палова гэтай колькасці прыпадае на краіны СНД, а трэць — на Заходнюю і Ўсходнюю Еўропу.

Іншыя песімістычныя прагнозы даходзяць нават да 50.000 ахвяраў (пераважна ад рака шчытападобнай залозы і лейкеміі).

Самая нізкая колькасць смяротных выпадкаў, якая прыводзіцца ў літаратуры па Чарнобылю, складае 200—600 чалавек у СССР і іншых месцах. Найвышэйшы прагноз даходзіць да 280.000 ахвяраў ад захворвання на рак.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Няўдзячная гэта справа – быць несавецкім палітыкам ў савецкай Беларусі

Віталь ЦЫГАНКОЎ

У Андрэя Макарэвіча ёсць адна вельмі глыбокая і мудрая песня пра "першых" і "другіх". Выпала дваім пайсці ў разведку боем, "подставить пуле лоб". Першы "шёл как танк, не зная броду", таму, вядома, сваёй мэты не дасягнуў і геройскі загінуў недзе пасярэдзіне. Затое другі быў асцярожнейшы, абачлівейшы, дайшоў да фініша, "и первым стал, и встал на пьедестал". Цяпер з другіх "печатают портреты", і дзеці ў школе вывучаюць іхнія імёны.

Гэта калізія "першы-другі" міжволі ўзгадваецца, калі разважаеш пра палітычны лёс БНФ. Дабравольна выбраць сябе няўдзячную ролю "першага" — мужны, і разам з тым самагубны для палітыкаў крок. Гэта своеасаблівы тып "Матросава ў палітыцы", калі герой кідаецца на амбразуру альбо калючы дрот, а па яго трупу пераможна бягуць заваёўваць варожыя вяршыні больш стрыманыя паслядоўнікі, як Грамада заняла месца арыштаванага БНФ на мітынгу 1 Мая.

Дастаткова ўспомніць толькі некалькі агульнавядомых фактаў з гісторыі БНФ, каб пераканацца, што Фронт і яго лідэр дабравольна бяруць на сябе ролю тарана масавай свядомасці. Артыкул Зянона Пазьняка ў "Звяздзе" пра Леніна ў 1993 годзе, які выклікаў літаральна сотні чытацкіх лістоў. Я, напрыклад, тады быў моцна ўражаны найперш тым, што чытачы абураліся фактамі з жыцця Леніна, якія, як мне здавалася, усім вядомыя з 1989 года.

Потым быў артыкул Пазьняка ў "Народнай газеце" "О русском империализме...", якім, па перакананні многіх, БНФ скасаваў працэнтаў 10 свайго электарата. Фактычна на працягу апошніх гадоў у дачыненні да Расіі Пазьняк праводзіць дзве асноўныя думкі: па-першае, Расія не можа быць нармальнай дэмакратычнай краінай, па-другое, Расія хоча ў той ці іншай форме падпарадкаваць сабе былыя рэспублікі СССР. З 1991 па 1994 год нашы ліберальныя журналісты з усёй моцы свайго таленту выстаўлялі Пазьняка нейкім недавумкам, здзіўляючыся, як можна гаварыць пра дэмакратычную Расію такое глупства. Цяпер я з нейкім нават зларадствам чытаю артыкулы тых жа публіцыстаў, якія яшчэ з большым талентам пішуць, што нармальная еўрапейская дэмакратыя Расіі сапраўды пакуль не свеціць, што расійскі народ усё больш запальваецца рэваншысцкімі, вялікадзяржаўніцкімі, антызаходніцкімі ідэямі. Дарэчы, збылося і яшчэ адно прадказанне Пазьняка аб немагчымасці на Беларусі існавання прарасійскіх дэмакратычных сіл.

І вось цяпер — хвіліна маўчання па Дудаеву... "Просты народ" у абурэнні, афіцыйная прэса ў захапленні (засвяціўся нарэшце!), умераныя дэмакраты ў трансе. "Рэйтынг упадзе, імідж разваліцца, аўтарытэт страціцца". І пасярод усяго гэтага тлуму і шуму мне хочацца задаць нявіннае пытанне: а што, уласна кажучы, здарылася?

Ёсць такі метад "кубачка кавы". Гэта значыць сесці і спакойна, без ранейшых забабонаў, адхіліўшыся ад устойлівых стэрэатыпаў, паразважаць над нейкай праблемай. Калі б кожны чалавек прымяніў гэты метад і, адключыўшыся ад інфармацыі расійскіх СМІ і ад сваіх савецкіх комплексаў, задумаўся над чачэнскай сітуацыяй, ён бы мог прыйсці толькі да наступнага: Расія амаль стагоддзе заваёўвала і вынішчала народы Паўночнага Каўказу. Пасля дзесяцігоддзяў вайны ў XIX стагоддзі наступіла прымусовае высяленне з радзімы ў 1940-я. Пасля ўсяго гэтага ці можа хто-небудзь растлумачыць, за што чачэнцы павінны любіць рускіх?

І яны іх ненавідзелі, ненавідзелі заўсёды, нават у самыя застойныя часы, аб чым, напрыклад, пастаянна пісалі мае сваякі з Грознага. Цяпер, калі ў адказ на жаданне дабіцца незалежнасці, Расія пачала бамбіць сёлы і ператварыла Грозны ў руіны, — якія пачуцці могуць зведваць чачэнцы?

Каб зразумець усё гэта і стаць — не, не на бок чачэнцаў — а хаця б на бок старонняга назіральніка, фактычна трэба толькі адно: **трэба мець не-расійскую свядомасць.** І тады, паглядзеўшы на гэтую бойню позіркам звычайнага еўрапейца ці амерыканца, усё становіцца максімальна ясным і адназначным: вялікая дзяржава вядзе вайну супраць маленькага народа, які яна калісьці захапіла і які прагне сваёй незалежнасці. Нашыя савецкія людзі заўсёды прымалі бок маленькага народа, калі размова ішла аб ЗША, Брытаніі ці Францыі. І цяпер яны не могуць стаць на шлях справядлівасці толькі па адной прычыне — у іх разуменні гэта **мы** (рускія, савецкія) ваюем, а **мы** ніколі не можам ваяваць несправядліва.

І вось чалавек з, мякка скажам, вельмі не-расійскай свядомасцю — Зянон Пазьняк — прыязджае з адной еўрапейскай дзяржавы ў другую, сваю. І гаворыць тое, што ў Еўропе (а асабліва ў Польшчы) успрымаецца зусім нармальна — просіць ушанаваць памяць чачэнскага лідэра. Мы не ў Еўропе, Зянон Станіслававіч. Гэта там, у Еўропе, мы — нармальныя, бо, як усе еўрапейцы, гаворым на сваёй мове, любім сваю культуру і аб'ектыўна глядзім, напрыклад, на расійскія войны. А на сваёй радзіме мы — меншасць, і як вучыць дэмакратыя, павінны падпарадкоўвацца большасці незалежна ад яе якасці.

Апошнім часам прыходзіць у галаву: "Як добра, што я не палітык!" Колькі разоў давялося б думаць адно, а гаварыць іншае. Колькі сур'ёзных артыкулаў не напісаў бы, хвалюючыся, як гэта ацэняць мае выбаршчыкі. Давялося б несці ўсялякае глупства накшталт таго, што я — за эканамічную інтэграцыю з Расіяй, хаця ўпэўнены: інтэграцыя двух убогіх эканомік можа дапамагчы толькі кансервацыі гэтай убогасці.

Прынцып БНФ — "гаварыць праўду" — прыгожы, але палітычна нявыйгрышны лозунг. БНФ як таран, які праломвае ленінскія, карупцыйныя, расійскія, чачэнскія ды іншыя трэшчыны ў савецкай свядомасці. А ў гэтыя расколіны на белым кані ўязджаюць іншыя, "другія". У іх ужо гатовы — і дзякуй Богу — набор зручных для ўспрымання шырокімі народнымі масамі фармулёвак: "Мы — за суверэнітэт і інтэграцыю", "*NATO* — не вораг, але ўступаць не трэба", "Мы — за беларускую мову, але гаворым па-руску", "У прэзідэнта дрэннае акружэнне, трэба яму памагчы". Мала хто з нармальных палітыкаў верыць у гэтую фразеалогію, але толькі з ёй можна стаць дэпутатам ці прэзідэнтам.

Хай становяца, я не супраць, яны ж такія цывілізаваныя, без адзінай памылачкі ў палітычнай біяграфіі. Хай толькі добра запамінаюць, аб чым сёння гаворыць БНФ, — праз год-два давядзецца самім гаварыць тыя ж словы.

А Фронт павінен зразумець, што "першыя" ніколі не выйграюць. Таму, магчыма, трэба падзяліць абавязкі — адныя сілы для пралому сцяны, іншыя — для пралазу ў створаныя дзіркі.

Увогуле ж, няўдзячная гэта справа — быць несавецкім палітыкам у савецкай Беларусі.

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Камунізм нанёс такую велізарную маральную шкоду расіянам, што пабудова капіталізму ў гэтай краіне зойме нашмат больш часу, чым у іншых краінах Усходняй Еўропы

Капіталізм па-расійску

Ян ВІНЕЦКІ

прафесар,
кіраўнік кафедры
на факультэце эканомікі
Еўрапейскага Універсітэта
ў Франкфурце-на-Одэры

Няма ніякіх шанцаў, каб у бліжэйшай перспектыве (10-20 гадоў) расійская эканоміка дасягнула ўзроўню рынку, блізкага да рынку Чэхіі, Венгрыі або Польшчы. Гэты працэс не толькі будзе значна павольнейшы, звязаны з большымі эканамічнымі і грамадскімі стратамі, ён таксама выкліча значныя грамадска-палітычныя катаклізмы.

Гэты тэзіс я магу пацвердзіць перш за ўсё аргументамі не эканамічнага плану, а тымі, якія недаацэньвае (або ўвогуле не бяруць пад увагу) большасць эканамістаў.

Калі ў 1990 годзе я быў старшынёй паседжання кангрэсу ЕЭС у Лісабоне, прысвечанага зменам ва Усходняй Еўропе, я прапанаваў спіс фактараў, якія прывялі да ўпадку камуністычнай сістэмы. Прафесар Любо Сірк з Лондана дадаў яшчэ адзін, які меў надзвычай важнае, хоць і няпростае для ацэнкі значэнне. А менавіта ён, звярнуў увагу на тое, што ў сярэдзіне 70-х пайшло на пенсію апошняе пакаленне, якое пачынала і вучылася працаваць перад вайной. Астатнія ж працавалі толькі пры камунізме, калі панаваў прынцып "ці стаіш, ці ляжыш — адна радасць". Канечне, не ўсе, але значная частка іх дэмаралізавалася, што відаць хоць бы па выніках выбараў у Польшчы і іншых постсацыялістычных краінах. З настальгіяй успамінаючы даўнія часы, люмпен-інтэлігенцыя і люмпен-пралетарыят галасуюць за экс-камуністаў, якія абяцаюць паварот да таго, што мінула, або за папулісцкія групоўкі палітычных банкрутаў, якія хочуць (хоць і не гавораць гэтага ўголас) мець капіталізм у магазіне, але сацыялізм на працы...

Хоць камуністычная дэмаралізацыя адбывалася ўсюды, аднак няўзброеным вокам відаць, што яна прывяла ў Расіі да значна большага спусташэння, чым у Цэнтральна Усходняй Еўропе або ў балтыйскіх краінах. Чаму? Я лічу — таму, што **ў Расіі назіраецца недахоп найважнейшага фактару цывілізацыі — традыцыі.**

Канечне, у розных слаях грамадства розных краін, дый у розных сем'ях светапогляд, які перадавала малодшым старэйшае пакаленне, быў больш або менш выразны. Гэта тычылася таксама вузейшага або шырэйшага поля — ад справаў бытавых да этыкі і палітыкі. Але ж была і перадача традыцыі ад тых, хто асабіста зведаў нармальнага жыцця. Аднак гэтая традыцыя разбуралася прапагандай, а яшчэ ў большай ступені карозіяй ідэалаў камунізму. Але, з другога боку, гэта ж стварала і супрацьвагу словам і сімвалам сістэмы.

Вусная традыцыя існавала ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, дзе амаль у кожнай сям'і жыў нехта, хто працаваў або хоць бы гадаваўся ў часах нармальных (гэта датычыць і анексаваных Савецкім Саюзам балтыйскіх рэспублік, сілай далучаных у 1939 г.). Аднак не было гэтай традыцыі на іншых абшарах былога СССР. Калі ў 1989—1991 гг. Саюз разваліўся, там ужо не было нікога, хто памятаў бы нармальны свет без камунізму. Вусная традыцыя, якую людзі ва Усходняй Еўропе і балтыйскіх краінах мелі шчасце пераймаць ад сваіх блізкіх, датычыла не толькі нармальнага светапогляду, але і таго, як у нармальным свеце трэба сябе паводзіць.

Ёсць яшчэ адно прынцыповае адрозненне — сістэма светапогляду, заснаваная на адвечных каштоўнасцях, у Савецкім Саюзе не толькі не шанавалася, але і пераследавалася з апантанасцю, на якую толькі былі здольныя тыя, хто пільнаваў стройнасць сістэмы. У выніку значная колькасць грамадзян савецкай дзяржавы перастала кіравацца якімі б там ні было этычнымі нормамі, прымала пад увагу толькі "тэхнічныя нормы выжывання". Менавіта з такім багажом досведу і нормаў паводзін Расія пачала пабудову эканамічнай нармальнасці — капіталістычнай рынкавай гаспадаркі.

Мы жывём у часах, калі страх перад тайнай паліцыяй знік, а мараль яшчэ не перайшла на нармальныя рэйкі. Натуральна, што кошты падтрымлівання парадку у дзяржаве і ў эканоміцы будуць у гэты перыяд вышэйшыя, чым у краінах стабілізаваных. Праблема ў тым, наколькі гэтыя кошты будуць вышэйшыя.

З прычыны высокага ўзроўню маральнай шкоды, якую прынёс камунізм, кошты пабудовы капіталізму ў Расіі будуць непараўнальна вышэйшыя і гэтая "адбудова" зойме нашмат больш часу. У свеце, дзе дамінуюць "тэхнічныя нормы выжывання", правілы гульні капіталістычнага рынку ягонымі ўдзельнікамі успрымаюцца прынцыпова іначай. Калі працаўнікі рынку гавораць пра "бязлітасную" канкурэнцыю, то маюць на ўвазе, напрыклад, што менш эфектыўны вытворца павінен павялічыць эфектыўнасць, бо інакш прападзе, збанкрутуе, будзе змушаны шукаць шчасця ў іншай галіне гаспадаркі або яго паглыне больш спраўны канкурэнт.

У Расіі канкурэнцыю разумеюць даслоўна: да суперніка высылаюць некалькі нанятых бандытаў, якія шмат разоў страляюць у канкурэнта, аж пакуль не ўпэўняцца, што забілі яго.

Так, уласна кажучы, і функцыянуюць расійскія "тэхнічныя нормы выжывання". Захад перыядычна узрушваюць паведамленні, як у Расіі гінуць банкіры, журналісты і іншыя нязручныя для такой канкурэнцыі людзі. З пункту погляду сфармаванай заходняй этыкі — гэта шакіруе. Але для тых, хто кіруецца толькі "тэхнічнымі нормамі выжывання", — гэта нармальна.

У канцы 80-х гг. у вялікіх гарадах СССР аж да 30 % нованароджаных трапляла адразу ў дзіцячыя дамы, бо бацькі адмаўляліся ад іх. Як можна спадзявацца на праявы сімпатыі ці хоць бы літасці да супрацоўніка, канкурэнта ці палітычнага праціўніка, калі гэтых чалавечых якасцей не праяўляюць нават да самых блізкіх? У 80-я гады англійскі часопіс *The Economist* надрукаваў артыкул, у якім выдатна паказаў дыспрапорцыю паміж ваеннай магутнасцю Савецкай дзяржавы і мізэрнымі дасягненнямі ў сферы эканомікі. Але дыспрапорцыя сягае глыбей. Насельніцтва Расіі (вялікакняжацкай, татарскай, царскай, камуністычнай) не толькі ніколі нічым рэальна не валодала, — акрамя тых, хто займаў нейкую прыступку ў іерархіі ўлады, — але таксама ніколі не мела грамадзянскіх правоў, якія ў розных краінах Еўропы за многія стагоддзі склаліся ў сістэму. Гэтая сітуацыя надзвычай ускладніла пабудову капіталістычнай рынкавай гаспадаркі і грамадзянскай супольнасці. А дэфіцыт маёмасных і палітычных правоў яшчэ аслабляе і без таго кволую прывязанасць да вуснай традыцыі. Вядома, адчуванне таго, што ты — зерне, якое бязлітасна мелюць жорны скарумпаванага дэспатызму, пераживаецца надзвычай пакутліва, асабліва тымі, хто мае лепшую адукацыю і таму больш схільны да рэфлексіі. У гэтым — прычына ўзнікнення так званых кампенсаторных механізмаў.

Усведамленне таго, што ты — ніхто і нічога не маеш, выклікае патрэбу быць задаволеным, а то нават і гордым хоць з чаго-небудзь.

Так узнікае ледзь не фанатычнае захапленне ідэяй магутнай дзяржавы, з вялікім ваенным патэнцыялам, з якім лічацца і якога баяцца іншыя. Быццё "нічым" на ўзроўні індывідуальным кампенсуецца быццём "нечым" на ўзроўні масавым.

Прагнозы наконт будучыні расійскай эканомікі песімістычныя. Капіталізм яшчэ доўга будзе ў Расіі сістэмай з высокімі "коштамі станаўлення" з прычыны слабых уяўленняў пра прынцыпы вольнага рынку ў галовах вялізнай большасці грамадзян.

Акрамя таго, гэты працэс будзе мець шмат паваротаў, аж да спробаў вяртання да камуністычнага мінулага. Ён будзе таксама перарывацца або заміраць у часы чарговых прыпадкаў імперскай ліхаманкі. Ліхаманкі, якой ёсць і будуць падвержаныя — з прычыны згаданых кампенсаторных механізмаў — усе расійскія ўрады, а не толькі прадстаўнікі чырвонага або карычневага трагладытызму.

З гэтых сумных прадказанняў заходні свет павінен быў бы зрабіць адпаведныя высновы, якія датычаць не толькі эканамічнай палітыкі.

Трэба пазбыцца ілюзіі, што рознага кшталту гарантыі або страхоўкі экспартных крэдытаў з'яўляюцца кароткатэрміновай інвестыцыяй у расійскі рынак, які хутка і паспяхова развіваецца ў нармальным кірунку.

Якраз наадварот, паколькі там да нармальнасці далёка як да Марса, такія сумнеўныя аперацыі па падтрымцы эканомікі павінны рабіцца пастаянна. І такая дапамога робіцца вельмі нявыгаднай справай для падаткаплацельшчыкаў.

Падобныя высновы трэба зрабіць і ў дачыненні да ўдзелу міжнародных фінансавых інстытутаў. Калі з прычын унутраных, пазаэканамічных, цывілізаванне гаспадаркі будзе трываць доўга і пры перыядычных патрасеннях, шматмільярдныя праграмы МВФ і Сусветнага Банку не маюць шанцаў дасягнуць пастаўленых мэтаў. У бліжэйшым будучым яны не выканаюць ні эканамічных задач, ні канчатковай палітычнай нармалізацыі расійскага грамадства. Доўга будзе трываць і лячэнне ад імперскай хваробы. Пакуль у Расіі пачне з'яўляцца нармальны капіталістычны парадак, а разам з ім і рост дабрабыту большай часткі грамадства, пройдзе яшчэ 20, а то і больш гадоў. **А пакуль не будзе гэтай нармальнасці, то імперская ліхаманка будзе трэсці Расію** — незалежна ад таго, якія ўступкі будзе рабіць Захад і хто будзе правіць у Крамлі.

Wprost

Беларусь отказывается от кооперации с Западом

В белорусском правительстве окончательно решен вопрос относительно целесообразности вступления республики во Всемирную торговую организацию.

После длительных согласований с заинтересованными ведомствами министерство сельского хозяйства и продовольствия Беларуси дало заключение о нецелесообразности присоединения страны к данной организации. В то же время некоторые аналитики отмечают ошибочность подобного шага, который будет способствовать углублению кризисных явлений в экономике и затормозит процесс внедрения новых технологий.

Вполне возможно, что одной из причин появления такого заключения стало то обстоятельство, что документами ГАТТ-ВТО запрещены прямые субсидии национальным производителям сельхозпродукции, в том числе субсидирование экспорта. Белорусских аграрников, привыкших работать сугубо на государственных дотациях, данное требование не устраивает. Поэтому были предприняты все меры, в том числе путем лоббирования интересов села в парламенте, чтобы не допустить вступления Беларуси в ВТО.

Советника президента пытались подкупить

Из осведомленных источников в Совете безопасности стали известны некоторые подробности недавнего ареста председателя правления Первого инвестиционного фонда (ПРИФ) Александра Саманкова.

В феврале этого года неустановленное лицо (его имя следствием скрывается) обратилось к советнику президента Александру Сазонову с просьбой оказать содействие в решении некоторых вопросов в пользу ПРИФа. За эту услугу чиновнику было обещано вознаграждение в размере 100 тысяч долларов. Однако г-н Сазонов по данному факту сделал заявление государственному секретарю Совета безопасности Виктору Шейману. Последний поручил сотруднику аппарата Совета безопасности Степану Сухаренко задержать взяткодателя, что и было сделано.

В ходе следствия задержанный дал показания, что является лишь посредником и действовал по указанию г-на Саманкова. В настоящее время г-н Саманков, в отношении которого Генеральной прокуратурой возбуждено уголовное дело, содержится в следственном изоляторе МВД Беларуси.

Бывшие соратники попали в немилость

В настоящее время по указанию президента Лукашенко комиссией из числа сотрудников Совета безопасности под руководством Степана Сухаренко ведется проверка хозяйственной деятельности государственного концерна "Химпромагроинвест".

Цели и причины столь внезапной проверки установить не удалось. Однако примечательным является то, что глава концерна г-н Бородич в период президентских выборов в Беларуси возглавлял коммерческую фирму "Коруна", которая предоставила на безвозмездной основе свой офис для размещения предвыборного штаба Александра Лукашенко.

Известный предприниматель Сергей Прокопович, в тот же период являвшийся генеральным директором фирмы "Руст" и обеспечивавший команду будущего президента автотранспортом, также испытал немилость Александра Лукашенко. Имеются сведения о подготовленном в администрации президента решении о юридической ликвидации фирмы "Руст".

В армии продолжает пропадать оружие

Из источника в Главном штабе Министерства обороны стало известно, что за последние десять дней в войсках обнаружена пропажа восьми автоматов АК-74.

Четыре из них были похищены со склада в одной из механизированных бригад, дислоцированной в Бресте, остальные — в гарнизонах Минской области. По данным фактам военной прокуратурой возбуждены уголовные дела.

СІМ



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Панядзелак 6 траўня

Белорусское телевидение
16.44 ТВ — школе.
17.20 Параграф.
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 Родное слово.
18.25 Экономикст.
18.35 MTV.
18.50, 0.15 Новости.
19.05 Крок.
19.40 "Это мы не проходили..."
19.55 Острый угол.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.45 Спортивный телекурьер.
22.05 Фильмотека. "Двадцать дней без войны."
23.45 Международный шахматный фестиваль "Минск-96".

ОРТ
5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.45 Новости.
8.15 "Секрет тропиканки".
9.05 Поле чудес.
10.05 Человек и закон.
10.30 "Угадай мелодию".
11.10 "Сохрани себя".
14.20 "Волшебные истории".
14.45 Марафон-15.
15.00 Звездный час.
15.40 "Элен и ребята".
16.05 Джэм.
16.30 "Семь дней спорта".
17.20 "Секрет тропиканки".
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию".
19.05 Фильм "Почему я жив?".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.40 "Виртуальная реальность".
21.35 Не стреляйте.
21.55 "До и после..."
22.55 Линия кино. "Нам не дано предугадать", "Объездчик".

Канал "Россия"
6.30 "Медвежьи истории".
7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.35 Вести.
7.20 "В этот день...".
7.30 "Деловая Россия".
8.00 Мультфильм.
8.10 Своя игра.
8.40 Крестьянский вопрос.
9.05 "Санта-Барбара".
10.25 "Сретенка... Встречи...". Телеспек.
11.40 Мировая деревня.
12.05 "Отверженный". Д/ф.
13.20 "Деловая Россия".
14.50 Колесо истории.
15.45 Там-там новости.
16.20 "Катюша". Д/ф.
16.40 Спасение-911.
17.30 Ваш партнер.
17.40 L-клуб .
18.25 Клуб губернаторов.
19.35 "Санта-Барбара".
20.30 "От форте до пьяно".
21.00 Погода на завтра.
21.05 "Холодное лето 53-го". Х/ф.
23.10 "Милицейская хроника".
23.20 Лучшие игры НБА.

Санкт-Петербург
10.35 Выбираем губернатора.
11.55, 12.55, 13.55, 14.55, 15.55, 17.55, 18.55, 19.55, 20.55, 21.55 Информ ТВ. "Сейчас".
12.05 "Первая любовь".
13.05 Срок ответа сегодня.
13.35 Советы садоводам.
13.45 Телеслужба безопасности.
14.05 "Мы вышли из блокадных дней". Т/ф.
14.45 "Орешек". Д/ф.
15.10 "Сегодня в парке". Т/ф.
15.35 Овертайм.
16.05 Стиль жизни.
16.10 "Мир Бастера". Телесериал для детей.
16.55 "Спортивное обозрение".
17.05 Только без паники!
17.35 Детское ТВ.
18.35 Большой фестиваль.
19.05 "Первая любовь".
20.05 Выбираем губернатора.
20.35 Телеслужба безопасности.
20.45 "Что наша жизнь...".
21.00 Спорт.
21.05 Выбираем губернатора.
22.05 На ночь глядя.
22.20 "Большая игра". Х/ф. с. 3.

IV канал, НТВ
7.00 Мир Вашему дому.
7.10 Пенсион.
7.30 "Хочу сделать признание". Х/ф. с. 1.
8.40 "Встреча для вас".
9.40 АБВГДейка.
10.00 Итальянский язык.
10.30, 13.30, 16.45 СИВ.
10.40 В поисках литературы.
11.20 "Поползновение".
11.30 АНК представляет...
12.00 Новая начальная школа.
12.30 Человек в рыночной экономике.
13.00 Алле-ап!
13.35 "Майор "Вихрь". Х/ф. с. 1.
14.45 Маленький концерт.
15.00 Ключи серебряные.
15.30 Уроки Фемиды.
16.00 Музыкальные новости.
16.15 "Муззон".
17.00 "Семейка Флинстоун".
17.30 "Футбольный клуб".
18.00, 21.00, 23.00 "Сегодня".
18.35 Герой дня.
19.00 Регулярные матчи НХЛ. "Кубок Стенли". Четвертьфинал.
21.35 Час сериала."Доктор Куин, женщина-врач".
22.30 "Времечко".
23.20 "Теннис в полночь".

Аўторак 7 траўня

Белорусское телевидение
7.30 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00, 15.00, 18.50, 0.10 Новости.
8.15 Авто-парк.
8.30 Бездельник.
9.00 ТВ — школе.
9.30 "Маринеско". Д/ф.
10.35 "Это мы не проходили..."
10.50 "Девочка из города". Х/ф.
12.05 Телевизионный Дом кино.
12.55 "Взять живым". Х/ф. с. 1.
15.15 ТВ — школе.
15.45 Мультфильмы.
16.15 "Все про все".
17.00 Педагогический экран.
17.20 Уроки Н.Новожиловой.
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 "Люди-легенды. Вера Хоружая". Д/ф.
18.15 "Будьте здоровы".
18.25 Экономикст.
18.35 MTV.
19.00 "Никто не заменит тебя". Х/ф.
20.05 Вертикаль.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.10 Х/ф "В шесть часов вечера после войны".
23.40 Крок.

ОРТ
5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.25 Новости.
8.15 "Секрет тропиканки".
9.05 Фильм "Почему я жив?".
9.50 Смехопанорама.
10.15 Мультфильм.
10.30 "Угадай мелодию".
11.10 "Мы и рынок".
14.20 "Волшебные истории".
14.45 Кварьете "Веселая квампания".
14.55 Мультитроллия.
15.10 Волшебный мир, или Синема.
15.40 "Элен и ребята".
16.05 ...До 16 и старше.
16.30 "Семь дней спорта".
17.20 "Секрет тропиканки".
18.10 Час пик.
18.35 "Угадай мелодию".
19.05 "Тема".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.40 Фильм "Зигзаг удачи".
22.35 Музыкальная программа "50 х 50".
23.35 "Батальоны просят огня". с. 1.
0.35 "Любимые песни". Ф/к.

Канал "Россия"
6.30 "Медвежьи истории".
7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.40 Вести.
7.20 "В этот день...".
7.30 "Деловая Россия".
8.00 Мультфильм.
8.20 L-клуб.
9.05 "Санта-Барбара".
12.00 Устами младенца.
12.30 "Страсти по Питеру".
13.20 "России верные сыны".
15.50 Месяцеслов.
16.20 "России верные сыны".
16.50 "Здоровье".
17.00 "Говорит Москва". Концерт.
19.35 "Санта-Барбара".
20.30 Сам себе режиссер.
21.00 Погода на завтра.
21.05 "России верные сыны".
22.55 "Испытание будущим". Х/ф.

Санкт-Петербург
10.35 Выбираем губернатора.
11.55, 12.55, 13.55, 14.55, 15.55, 17.55, 18.55, 19.55, 20.55, 21.55 Информ ТВ. "Сейчас".
12.05 "Первая любовь".
13.05 Срок ответа сегодня.
13.35 Советы садоводам.
13.45 Телеслужба безопасности.
14.05 К 51-й годовщине Великой Победы.
14.35 "Обрящете душам Вашим". Т/ф.
15.05 "Три такта". Т/ф.
15.35 Мультфильм.
16.05 Стиль жизни.
16.10 "Мир Бастера".
16.55 "Спортивное обозрение".
17.05 Только без паники!.
17.30 Показывает ЛОТ.
18.35 Большой фестиваль.
19.05 "Первая любовь".
20.05 Выбираем губернатора.
20.35 Телеслужба безопасности.
20.45 "Что наша жизнь...".
21.00 Спорт.
21.05 Выбираем губернатора.
22.05 На ночь глядя.
22.20 "Большая игра". с. 5.

IV канал, НТВ
7.00 Мир Вашему дому.
7.10 Пенсион.
7.30 "Хочу сделать признание" с. 2.
8.50 "Родные напевы". Концерт.
9.20 Семейное ли это дело?
9.40 Французский для детей.
10.00 "Французский язык в действии".
10.30, 13.30, 16.45 СИВ.
10.40 Георгиевские кавалеры.
11.30 АНК представляет...
12.00 Наука-видео.
12.30 Человек в рыночной экономике.
13.00 Мировая деревня.
13.35 "Майор "Вихрь". с. 2.
14.50 Видеопоэзия.
15.00 "Дерево 42-го". Д/ф.
15.30 Соседи по планете.
16.00 Музыкальные новости.
16.15 "Муззон".
17.00 "Семейка Флинстоун".
17.30 "Состоятельная женщина: удержать мечту".
18.00, 21.00, 23.00 "Сегодня".
18.35 Герой дня.
19.00 Фильм "Октагон".
20.50 "Доктор Угол".
21.35 Час сериала. "Доктор Куин, женщина-врач"
22.30 "Времечко".
23.20 "Большой ринг".
23.50 Меломания.

Серада 8 траўня

Белорусское телевидение
7.30 Утренний коктейль.
7.50 Экономикст.
8.00, 15.00, 18.50, 0.10 Новости.
8.15 "Нам рано жить воспоминаньями..." Ф/к.
9.00 ТВ — школе.
9.30 "У войны не женское лицо". Д/ф.
10.20 "Зорная ростань".
11.00 Видимо-невидимо.
12.00 "Взять живым". с. 2 и 3.
15.15 "Иван". Х/ф.
16.30 Арсенал.
17.00 Кредо.
17.20 Гости в дом.
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 Торжественное заседание и концерт Дню Победы.
20.05 "Кто это?"
20.10 Супергол.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.10 "Они сражались за Родину". Х/ф. с. 1.
23.30 Королевская охота.

ОРТ
5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00, Новости.
8.15 "Секрет тропиканки".
9.05 "Тема".
9.45 "В мире животных".
10.30 "Угадай мелодию".
11.10 "Контакт".
11.50 "На всю оставшуюся жизнь..." с. 4.
12.50 "Старший сын". с. 2.
14.20 "Волшебные истории".
14.45 Кактус и К.
14.55 До-ми-соль.
15.10 Зов джунглей.
15.40 "Элен и ребята".
16.05 "Тет-а-тет".
16.30 "Семь дней спорта".
17.20 "Секрет тропиканки".
18.20 "Угадай мелодию".
18.50 Футбол. Чемпионат России.
19.45 "Спокойной ночи, малыши!".
20.00 Время.
20.40 Фильм "Проверка на дорогах".
22.25 "Сиреневый туман".
23.15 "Батальоны просят огня". с. 2.

Канал "Россия"
6.30 "Медвежьи истории".
7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15 Вести.
7.20 "В этот день...".
7.30 "Деловая Россия".
8.00 "Золотой цыпленок". Х/ф.
9.10 Мультфильмы.
9.30 Проще простого.
10.20 "Небесный тихоход". Х/ф.
11.35 "Этот современный "Современник".
12.30 Наш сад.
13.20 "Деловая Россия".
14.55 "Гладиаторы".
15.45 Там-там новости.
16.20 Россия в лицах.
16.45 "Вопросы рядового гражданина".
16.55 Торжественная встреча героев войны.
17.50 "Мы мечтали о мире..." Д/ф.
18.25 Лидер-прогноз.
19.35 Праздничный концерт.
21.05 Погода на завтра.
21.10 Футбол. Кубок кубков. Финал. "Пари Сен-Жермен" (Франция) — "Рапид" (Австрия).
23.30 "На Муромской дорожке". Х/ф.
0.55 Звуковая дорожка.

Санкт-Петербург
10.35 Выбираем губернатора.
11.55, 12.55, 13.55, 14.55, 15.55, 17.55, 18.55, 19.55, 20.55, 21.55 Информ ТВ. "Сейчас".
12.05 "Первая любовь".
13.05 Срок ответа сегодня.
13.35 Советы садоводам.
13.45 Телеслужба безопасности.
14.05 К 51-й годовщине Великой Победы.
14.35 "Созвучие". Музыкальный телефильм.
15.05 "Я помню чудное мгновение". Т/ф.
16.05 Стиль жизни.
16.10 "Мир Бастера".
16.55 "Спортивное обозрение".
17.05 Только без паники!.
17.30 Показывает ЛОТ.
18.35 Большой фестиваль.
19.05 "Первая любовь".
20.05 Выбираем губернатора.
20.35 Телеслужба безопасности.
20.45 "Что наша жизнь...".
21.00 Спорт.
21.05 Выбираем губернатора.
22.05 На ночь глядя.
22.20 "Большая игра". с. 6.

IV канал, НТВ
7.00 Мир Вашему дому.
7.10 Пенсион.
7.30 "Был месяц май". Х/ф.
9.20 Помнишь ли ты?
9.40 Немецкий язык для детей.
10.00 Немецкий язык.
10.30, 13.30, 16.45 СИВ.
10.40 Ордена России.
11.30 АНК представляет...
12.00 Аудитория.
12.30 Человек в рыночной экономике.
13.00 Петербургские истории.
13.35 "Майор "Вихрь". с. 3.
15.00 "Знать не можешь доли своей". Д/ф.
16.00 Музыкальные новости.
16.15 "Муззон".
17.00 "Семейка Флинстоун"
17.30 "Состоятельная женщина: удержать мечту"
18.00, 21.00, 23.00 "Сегодня".
18.35 Герой дня.
19.00 Фильм "Наш дом".
20.40 "ТЭФИ-96": кто есть кто.
21.35 Час сериала. "Доктор Куин, женщина-врач"
22.30 "Времечко".
23.20 "Такова спортивная жизнь".
